У старажытнасці нашы продкі стварылі самую багатую сярод усіх славянскіх народаў міфалогію. Гэта наш гонор і наш духоўны скарб. І з гэтым скарбам вучні падрабязна знаёмяцца ў 6 класе на ўроку беларускай літаратуры. Цікава такое знаёмства прайшло *15 кастрычніка* ў 6 “В” класе. Тэма ўрока “Міфы пра істот”. Па-першае, дзеці даведаліся пра разнастайныя імёны духаў, па-другое, зрабілі паведамленні пра цмока, ліхаманак, кашчэя бессмяротнага, па-трэцяе, намялявалі міфічных істот на паперы і абаранілі свае малюнкі. Вучні атрымалі высокія адзнакі. Упэўнена, што творчы падыход да вывучэння дадзенай тэмы паспрыяе яе грунтоўнаму засваенню.



Настаўніца беларускай мовы і літаратуры Кайданава В.В.



